універсітэцкага навучання. Гэта забяспечыць рэальнае ўзаемадзеянне педагагічных дысцыплін са спецыяльнымі ў справе фарміравання музыканта-інструменталіста. Тады псіхолага-педагагічная падрыхтоўка не будзе адносна самастойным аспектам работы, а стане натуральнай часткай сістэмы прафесійнага выхавання музыканта-выкладчыка.

Быстроў Г.А.,
канд.пед.навук,
дацэнт

# АДЗІНСТВА ЭТЫЧНЫХ І ЭСТЭТЫЧНЫХ АСПЕКТАЎ У МАРАЛЬНА-ЭСТЭТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ СТУДЭНТА-МУЗЫКАНТА

Эстэтычная культура, высокія маральныя якасці людзей не фарміруюцца самі па сабе. Яны з'яўляюцца вынікам павышэння агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню асобы, далучэння яе да мастацкіх каштоўнасцей, узмацнення ролі маральных і эстэтычных фактараў ва ўсіх сферах сацыяльнай практыкі. Вось чаму ў распрацоўцы праблем маральна-эстэтычнага выхавання студэнцкай моладзі сродкамі музыкі надзвычай важна ўзаемадзеянне маральнага і эстэтычнага як канкрэтна-гістарычных з'яў грамадскага быцця.

Разуменне этычнай ролі мастацтва, эстэтычных пачуццяў, іх значнасці ў грамадскім жыцці чалавека, у самарэгуляцыі яго псіхічных функцый, у станаўленні маралі адыходзіць сваімі каранямі ў далекае мінулае чалавецтва і звязана з паняццем "катарсіс". У вызначэнні "катарсіса" Арыстоцель падкрэсліваў: "Коль музыка способна оказывать известное воздействие на этическую сторону души, то, очевидно, она должна быть включена в число предметов воспитания молодежи".

У цяперашні час у практыцы маральнага выхавання ўсё больш увагі ўдзяляецца выхаванню сферы пачуццяў асобы. Менавіта на ўзроўні вышэйшых эмоцый адбываецца ўзаемадзеянне і ўзаемапранікненне маральнага і эстэтычнага. Эстэтычныя пачуцці, эмацыянальны вопыт, засвоены ў працэсе дзейнасці, з'яўляюцца асновай маральнага выхавання студэнтаў-прапагандыстаў музычнай культуры.

Вельмі важна, што мастацтва выхоўвае не шляхам дыдактычных сродкаў,не шляхам маралізіравання, а непасрэдным уздзеяннем на пачуцці чалавека, развіваючы ўсе бакі асобы.

Рашэнне праблемы маральна-эстэтычнага выхавання студэнтаў сродкамі музыкі цесна звязана з правільным успрыманнем яе. Успрыманне музыкі нельга зводзіць толькі да гукавога. Згодна з дадзенымі псіхалагічнай навукі дэтэрмінацыя работы галаўнога мозга ў чалавека, у адрозненне ад жывелы, носіць не толькі біялагічны, але перш за ўсё і галоўным чынам сацыяльны характар.

Асвойваючы музычную спецыялізацыю, студэнты павінны ўсвядоміць асобую важнасць разумення характару гучання музыкі. Уважлівае ўслухоўванне, глыбокае пранікнёнее ў змест гэтага гучання з'яўляюцца асновай работы над выкананнем таго ці іншага музычнага твора. Характар музычнага гучання, выяўляючы пэўны эмацыянальны стан чалавека, у той жа час раскрывае і некаторыя яго маральныя якасці ў адносінах да сябе, да людзей, з'яў прыроды, падзей рэчаіснасці. Характэрныя прыметы гучання музыкі могуць як бы маляваць рысы характару чалавека, яго унутраны стан. Выхаваўчае ўздзеянне музычнага твора залежыць ад таго, з якімі жыццёвымі эмоцыямі выканаўца звязвае свае эстэтычныя эмоцыі, выкліканыя дадзеным творам. Жыццёвыя эмоцыі могуць быць выкліканы маральным і амаральным учынкамі. Музыка таксама можа выклікаць станоўчыя і адмоўныя эмоцыі. Вось чаму ў выхаваўчым уздзеянні музыкі вялікае значэнне мае ўстаноўка.

Вобраз музычнага твора не можа цалкам адпавядаць той ці іншай асацыяцыі, а толькі супадае з ёй у самых агульных рысах. Каб стварыць "падрабязны" вобраз, неабходна пабудаваць "суб'ектыўную эмацыянальную праграму" твора. Але належыць улічваць, што музычны вобраз не можа вызначацца толькі адной эмацыянальнасцю. Ён складаецца з эмацыянальных уражанняў, перажыванняў, звязаных паміж сабой вызначаным мастацкім зместам, вызначанай лагічнай заканамернасцю.

Мы распрацавалі слоўнік-набор маральных якасцей, эмацыянальны змест якіх адпавядае вызначаным прыметам характару гучання музыкі. Ён дапамагае як слухачу, так і выканаўцу ўслухвацца і разумець значэнне асобных элементаў музычнай мовы (розных сугучнасцей, меладычных і рытмічных інтанацый, тэмбраў, дынамікі, артыкуляцыі і інш.), дыферэнцыра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваць свае перажыванні. Слоўнік маральных якасцей дае магчымасць даследаваць эмацыянальны водгук студэнтаў на той ці іншы музычны твор.

Улічваючы, напрыклад, тое, што ў народнай музыцы ярка раскрываюцца розныя пачуцці, думкі і характар чалавека, самы разнастайны настрой, мы ў рабоце над выкананнем народных песень засяроджвалі ўвагу студэнтаў на дакладным вызначэнні характару песень, на адпаведнасці характэрных рыс музычнага вобраза характару выканання, на перакладзе мастацкага вобраза ў рэальнае гучанне.

Студэнты, такім чынам, добра ўсведамляюць сувязь музыкі з жыццём. Яны прыходзяць да разумення таго, што музыка можа ўплываць на жыццё толькі праз непасрэднае ўздзеянне на чалавека, нараджаючы ў ім пачуцці і думкі, змяняючы яго характар і адносіны да жыцця, яго сілу волі, выхоўваючы ў ім маральна-эстэтычныя ідэалы.

Царова А.А.,
выкладчык

## ПСІХАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ МУЗЫЧНАГА НАВУЧАННЯ СТУДЭНТАЎ

Вывучэнне логікі музычнага мастацтва на аснове абгрунтаванасці сферы мастацка-творчага мыслення дае магчымасць пошуку эфектыўных адукацыйных фактараў.

Ажыццяўленне прымальнага выбару ў вызначэнні напрамку і структуры мастацкай адукацыі мае на ўвазе зместавую характарыстыку дзейнасці навучэнца. Менавіта ў рамках спецыфічнай пазнавальнай сістэмы мастак выяўляе спецыяльныя здольнасці, а яго псіхічныя працэсы набываюць спецыфічным вобразам афарбаваныя функцыі.

Псіхалагічны механізм мастацкага пазнання заключаны ў супастаўленні з'яў рэчаіснасці з мастацкім эталонам.

Спецыфіка разумення мастака заключана ў звязванні спецыфічнай мовы з такімі класамі з'яў, для выяўлення якіх у мове іншых мастацтваў няма падставы.

Разгортванне вобраза - асноўная сфера мастацка-творчага мыслення. Ад вобразнага да паняційна-лагічнага рухаецца разуменне творцы. Вобразна-дзейныя асацыяцыі актуалізуюць сэнсавай адзначаных разуменнем мастака сувязей элементаў матэрыялу творчасці.

На ўзроўні паняційна-лагічнага зместу актуалізуюцца больш складаныя структуры сістэмы спецыфічнай мовы, утвараюцца сэнсавыя элементы. Пераважнай асновай асацыятыўных сувязей з'яўляюцца сувязі элементаў матэрыялу творчасці ў розных кантэкстах. Гэты працэс грунтуецца на засваенні сістэмы норм і ацэнак канкрэтнага мастацтва.

У музычным мастацтве любая рэчаіснасць асэнсоўваецца па эстэтычных законах з апорай на эталоны музычнага мастацтва.

Сэнс запісу музычнага тэксту ўсведамляецца галоўным чынам у форме практычнага і моўнага вопыту. Так, у працэсе выканальніцкай практыкі ў музыканта ўдасканальваецца сістэма ўзаемадзеяння паміж стымуламі, якія прадстаўлены ў інфармацыі музычнага тэксту, і працэсамі адбору ў памяці на аснове ўяўлення і разумення. Гэта азначае, што музыкант павінен разумець значэнне элементаў тэксту і, успрымаючы іх як фармальную характарыстыку ідэальнага вобраза, канструяваць яго мадэль на падставе сваіх ўяўленняў аб вобразе.

У працэсе навучання сэнсавая каардынаванасць паміж запісам і гучаннем твора становіцца асновай тлумачэння працэсу вобразнай творчасці. Так, музыкант можа ўлавіць і перадаць разнастайны пачуццёва-эмацыянальны настрой, інтэграваныя моманты, у якіх заключаны элементы вобразаў і думак аўтарскага твора.

Нотны тэкст, з'яўляючыся графічным эквівалентам музычнага, нясе ў сабе адзнакі граматычнай формы інтанацыі. Граматычны каркас нотнага тэксту пры пошуку сэнсаўтваральных элементаў музычнага твора рэпрэзентуецца мастацкімі ўяўленнямі выканаўцы і разглядаецца як праграма стварэння структур, адпаведных стылю кампазітара.

На матэрыяле супастаўлення структур можна разглядаць пытанне аб значэнні элементаў інтанацыйнай праграмы, распазнаванні інтанацыйных канфігурацый (комплекс элементаў, якія нясуць сэнсавую нагрузку) і г.д. Усе гэтыя працэсы аб'яднаны працэсам вылучэння сэнсу.

Лакалізацыя гукавых стымулаў адносна элементаў нотнага тэксту на шляху яго ўспрымання звязана з аналізам сінтаксічных структур твора. Спецыфіка музычнай мовы прадвызначае мысліцельныя працэсы выканаўцы. Мова тут выступае сродкам, пры дапамозе якога адлюстроўваюцца пачуцці і думкі аб з'явах, арга-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ